## ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА ВА УСХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ І ЦЭНТРАЛЬНАЙ АЗІІ АГЛЯД ЗА 2019

# БЕЛАРУСЬ

**Рэспубліка Беларусь**

Кіраўнік дзяржавы: **Аляксандр Лукашэнка**

Кіраўнік урада: **Сяргей Румас**

Беларусь заставалася адзінай у Еўропе і постсавецкім рэгіёне дзяржавай, дзе выкарыстовывалася смяротнае пакаранне, якая вынесла тры смяротныя прысуды і пакарала смерцю па меншай меры трох зняволеных. Змены ў заканадаўстве ў сферы правоў на свабоду выказвання меркаванняў і мірных сходаў прывялі да яшчэ большых абмежаванняў, у прыватнасці, свабоды ў інтэрнэце і дзейнасці СМІ, а таксама права на пратэст. Існуюць дакладныя звесткі пра сотні дзяцей і маладых людзей, якія адбываюць працяглыя турэмныя тэрміны за нязначныя негвалтоўныя злачынствы, звязаныя з наркотыкамі. Уразлівыя групы насельніцтва, і тым ліку ромы і ЛБГТІ, па-ранейшаму падлягаюць рызыцы дыскрымінацыі, хоць былі зробленыя некаторыя пазітыўныя крокі па недапушчэнні дэпартацыі замежных грамадзянаў, якія могуць падлягаць рызыцы катаванняў або іншых відаў жорсткага абыходжання ў сваіх краінах.

## Для даведкі

Эканамічны рост быў павольным. Беларусь па-ранейшаму застаецца моцна залежнай у эканамічным дачыненні ад Расіі, у той час жа час паміж імі захоўвалася напружанасць з-за коштаў на імпартаваныя энерганосьбіты і супраціву Беларусі ісці шляхам далейшай інтэграцыі, якая магла б пагражаць яе суверэнітэту. У чэрвені 2019 года ў Мінску прайшлі Еўрапейскія гульні. Парламенцкія выбары ў лістападзе прайшлі пры нізкай яўцы, у выніку іх паўстаў цалкам лаяльны прэзідэнту парламент. Незалежныя мясцовыя і міжнародныя назіральнікі шырока раскрытыкавалі выбары за невыкананне дэмакратычных стандартаў падчас іхнага правядзення. Шмат якія кандыдаты, што лічыліся нелаяльнымі да рэжыму, былі дыскваліфікаваныя па сумнеўных тэхнічных прычынах, а ўсе абвінавачванні ў фальсіфікацыі вынікаў галасавання былі праігнараваныя.

## Смяротнае пакаранне

Прынамсі, тры чалавекі былі таемна пакараныя смерцю.

Трынадцатага чэрвеня адвакатка Аляксандра Жыльнікава хацела наведаць яго ў турме, а ёй сказалі, што яе кліент "адбыў па прысуду". І да канца года сям'я ўсё яшчэ не атрымала афіцыйнай інфармацыі пра ягонае пакаранне смерцю. Няма афіцыйнай інфармацыі і пра яго суўдзельніка Вячаслава Сухарко, але лічыцца, што той таксама быў пакараны смерцю. Камітэт ААН па правах чалавека зрабіў запыт прыпыніць выкананне прысуду Аляксандру Жыльнікаву на час разгляду яго справы. Пачынаючы з 2010 года, Беларусь праігнаравала 13 іншых падобных зваротаў гэтага Камітэта і пакарала смерцю зняволеных, справы якіх знаходзіліся на разглядзе. Аляксандр Асіповіч быў пакараны смерцю 17 снежня, яго смяротны прысуд быў вынесены 9 студзеня.

Яшчэ дзве асобы былі прысуджаныя да смяротнага пакарання за забойствы па іншых справах: Віктар Паўлаў і Віктар Сергіль.

## Свабода выказвання меркаванняў

Свабода выказвання меркаванняў па-ранейшаму строга абмежаваная ў заканадаўстве і на практыцы. Апазіцыянеры і іншыя нязгодныя сутыкаліся з пераследам і іншымі рэпрэсіямі з боку ўладаў, у тым ліку шляхам узбуджання адміністрацыйных і крымінальных працэсаў.

Змены ў законе аб СМІ, якія набылі моц у снежні 2018 года, зрабілі значна больш жорсткім дзяржаўны кантроль над інтэрнэт-СМІ. Закон абавязаў зарэгістраваныя і незарэгістраваныя інтэрнэт-СМІ рэгістраваць імёны людзей, якія пакідаюць каментары і прадстаўляць адпаведную інфармацыю ўладам па запыце. Ён таксама ўвёў адказнасць уладальнікаў зарэгістраваных інтэрнэт-СМІ за змест каментароў.

Нягледзячы на перапынак у пераследзе журналістаў пад час правядзення Еўрапейскіх гульняў у Мінску ў чэрвені, улады працягвалі накладаць вялікія штрафы на журналістаў-фрылансераў, якія супрацоўнічалі з міжнароднымі СМІ. Артыкул 22.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях ("Незаконны выраб і распаўсюд прадукцыі сродкаў масавай інфармацыі") выкарыстоўваўся для пакарання журналістаў, якія прадстаўлялі матэрыялы замежным СМІ, не маючы акрэдытацыі у Міністэрстве замежных спраў.

Доступ да незалежнага сайту навінаў "Хартыя'97" па-ранейшаму заставаўся заблакаваным пасля таго, як улады абмежавалі доступ да яго ў студзені 2018 года.

Працягваўся пераслед анархіста і былога вязня сумлення Зміцера Паліенкі. Ён быў арыштаваны і ўтрымліваўся ў папярэднім зняволенні з сакавіка па кастрычнік, супраць яго было высунутымі чатыры абвінавачванні. Тры з якіх былі відавочна надуманымі і былі знятыя падчас судовага разгляду, аднак, ён быў асуджаны на неперакаанаўчых падставах і атрымаў пакаранне за хуліганства ў выглядзе абмежавання волі без накіравання ў выпраўленчую ўстанову, якое ён абскардзіў у канцы года.

## Свабода сходаў

Права на свабоду мірных сходаў па-ранейшаму строга абмяжоўваецца заканадаўствам і правапрымяняльнай практыкай, а асобы, якія спрабавалі скарыстацца з яго, падлягалі арыштам з боку міліцыі (часта з ужываннем празмернай сілы), буйным штрафам і адвольным затрыманням.

Змены ў Законе аб масавых мерапрыемствах набылі моц у студзені і ўвялі новыя працэдуры і грашовыя сумы для арганізатараў публічных мерапрыемстваў, якіх абавязалі плаціць за паслугі міліцыі, хуткай дапамогі і прыборкі тэрыторыі. Мала таго, што ўсе сходы па-ранейшаму патрабавалі папярэдняга ўведамлення і адмысловага дазволу ўладаў, дык працэдура ўведамлення была распаўсюджаная і на канкрэтныя, папярэдне вызначаныя для сходаў без папярэдняга дазволу месцы (як правіла, у аддаленых раёнах). На практыцы дазвол на правядзенне сходаў у іншых месцах часта не даваўся або зацягваўся.

Артыкул 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях ("Парушэнне правілаў арганізацыі і правядзення масавых мерапрыемстваў") па-ранейшаму выкарыстоўваўся, каб перашкаджаць грамадзянам ажыццяўляць сваё права на мірныя сходы.

Неафіцыйныя святкаванні Дня Волі ў сакавіку былі абмежаваныя. Арганізатары акцыі 24 сакавіка і мірныя пратэстоўцы былі затрыманыя падчас гэтага загадзя дазволенага мерапрыемства ў Кіеўскім парку ў Мінску, у якім узялі ўдзел больш за 1000 чалавек. Незалежныя СМІ і прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці 25 сакавіка былі пазбаўленыя магчымасці правесці мірнае памятнае мерапрыемства на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску ва ўмовах узмоцненага міліцэйскага ачаплення. Прынамсі 15 асобаў былі затрыманыя ў міліцэйскія машыны без апазнавальных знакаў. Усе затрыманыя ў гэтыя два дні былі пазней вызваленыя без прад'яўлення абвінавачванняў.

Нягледзячы на заклікі Спецыяльнага дакладчыка ААН аб сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі паважаць асноўныя свабоды напярэдадні лістападаўскіх парламенцкіх выбараў, дзясяткі людзей, уключаючы кандыдатаў на выбарах, былі асуджаныя або прыцягнутыя да адміністрацыйнай адказнасці паводле артыкулу 23.34 за мірны ўдзел у недазволеных акцыях пратэсту падчас парламенцкай выбарчай кампаніі і ў снежаньскіх акцыях пратэсту супраць магчымага паглыблення інтэграцыі з Расіяй. Пратэстоўцы былі аштрафаваныя і/або прысуджаныя да адміністрацыйнага арышту на тэрмін ад пяці да 45 сутак, а неаднаразовыя просьбы адвакатаў аб доступе да некаторых затрыманых былі адвольна адхіленыя.

## Свабода аб'яднанняў

Па-ранейшаму існавалі перашкоды для афіцыйнай рэгістрацыі незалежных недзяржаўных арганізацый, а заяўкі на рэгістрацыю адхіляліся па адвольных прычынах.

Скасаваны артыкул 193.1 Крымінальнага кодэкса, які прадугледжвў крымінальную адказнасць за ўдзел у дзейнасці незарэгістраванай арганізацыі, быў заменены артыкулам 23.88 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, які даў права ўладам штрафаваць без судовага разгляду "парушальнікаў" на суму да 1275 беларускіх рублёў (615 долараў ЗША).

## Сістэма правасуддзя - ювенальная юстыцыя і справядлівае судовае разбіральніцтва

Існуюць дакладныя звесткі пра сотні дзяцей і маладых людзей, якія адбывалі працяглыя турэмныя тэрміны за нязначныя негвалтоўныя злачынствы, звязаныя з наркотыкамі. Сярод іх дзясяткі, а магчыма, і сотні адбывалі працяглыя тэрміны пакарання за дробныя негвалтоўныя злачынствы, звязаныя з наркотыкамі і ўчыненыя ў дзяцінстве. Прысуды многіх з іх сталі вынікам несправядлівага судовага разгляду, а дзеці ва ўзросце 17 і нават 16 год былі пасаджаныя ў турму на тэрмін да 11 гадоў паводле артыкулу 328 Крымінальнага кодэкса аб незаконным абароце наркотыкаў у якасці членаў злачынных "груп", прычым часта без вызначэння іншых членаў груп. У кастрычніку пяць спецыяльных працэдур арганізацыі Аб'яднаных Нацый, уключаючы Працоўную групу па адвольных затрыманнях і Спецыяльнага дакладчыка па пытаннях катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных і зневажальных годнасць відаў абыходжання і пакарання, выказалі ўладам сваю заклапочанасць з нагоды становішча дзяцей, што ўтрымліваліся пад вартай у сувязі са злачынствамі, звязанымі з наркотыкамі.[1]

У папярэднія гады паведамлялася пра факты празмернага ўжывання сілы і іншыя парушэнні правоў чалавека супрацоўнікамі праваахоўных органаў, уключаючы шматгадзіннае ўтрыманне пад вартай без сувязі са знешнім светам і жорсткае абыходжанне з дзецьмі, арыштаванымі за наркотыкі, а таксама фальсіфікацыю доказаў шляхом правакавання на злачынства. У жніўні былы начальнік аддзелу міліцыі з Магілёва быў асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі за правакаванне людзей на злачынства – як меркавалася, наркагандаль. Суд над ім быў закрытым, а абвінавачы прысуд - засакрэчаным, што пазбавіла меркаваных ахвяраў яго злачынстваў магчымасці аспрэчыць свае прысуды.

Ёсць шмат сведчанняў пра жорсткія ўмовы ўтрымання і дыскрымінацыйнае абыходжанне ў турмах з дзецьмі, асуджанымі за злачынствы, звязаныя з наркотыкамі.

## Дыскрымінацыя

Некаторыя ўразлівыя групы меншасцяў па-ранейшаму сутыкаліся з дыскрымінацыяй і недастатковай абаронай перад законам, што прыводзіла да атмасферы страху і самацэнзуры.

### Ромы

Супольнасць ромаў заставалася сацыяльна маргіналізаванай, асабліва ў сферы занятасці і адукацыі.

У траўні, пасля меркаванага забойства супрацоўніка дарожнай міліцыі, улады Магілёва правялі ператрусы ў шэрагу суполак ромаў, ужыўшы празмерную сілу, каб затрымаць дзясяткі людзей, у тым ліку дзяцей. Паводле звестак мясцовых праваабаронцаў, больш за 50 мужчынаў былі адвольна затрыманыя на тры дні і вызваленыя без прад'яўлення абвінавачванняў. Пазней, прычынай смерці міліцыянера назвалі самагубства. Нягледзячы на афіцыйныя прабачэнні перад суполкамі ромаў, улады не распачалі ніякіх справаў супраць тых супрацоўнікаў праваахоўных органаў, якія ўжылі празмерную сілу.

### ЛГБТІ

Лесбіянкі, геі, бісексуальныя і трансгендарныя людзі і інтэрсексы (ЛГБТІ) працягвалі сутыкацца з пераследам, уключаючы стыгматызацыю і дыскрымінацыйную рыторыку з боку дзяржаўных чыноўнікаў.

У траўні Міністэрства ўнутраных справаў апублікавала на сваім сайце артыкул, у якім гаварылася пра "разбуральны ўплыў поглядаў і ідэй ЛГБТ-супольнасці" і сцвярджалася, што "хоць навука не ўстанавіла прамой сувязі паміж педафіліяй і аднаполымі сексуальнымі адносінамі, лічбы кажуць самі за сябе".

Пасля вербальнага і фізічнага нападу на рэжысёра Міхаіла Купрыча ў жніўні, здзейсненага асобай, якая палічыла яго геем, 24 снежня суд у Менску прызнаў нападніка вінаватым у "злосным хуліганстве" паводле артыкула 339.2 і асудзіў яго да 18 месяцаў абмежавання волі і абавязаў яго выплаціць матэрыяльную кампенсацыю Міхаілу Купрычу. Аднак хадайніцтва адваката Міхаіла Купрыча аб змене першапачатковага абвінавачвання ў хуліганстве, каб улічыць матыў нянавісці, было адхіленае.

## Правы мігрантаў і просьбітаў прытулку

[1] https://spcommreports.ohchr.org/TMResultsBase/DownLoadPublicCommunicationFile?gId=24893

Беларусь працягвае прымусова вяртаць замежных грамадзянаў, у тым ліку просьбітаў прытулку, у краіны, дзе ім пагражае небяспека стаць аб'ектам сур'ёзных парушэнняў правоў чалавека, уключаючы катаванні і іншыя віды жорсткага абыходжання, чым парушае прынцып недапушчальнасці прымусовага вяртання.

У траўні ў мінскім аэрапорце быў затрыманы апазіцыйны актывіст і журналіст з Інгушэціі Ісмаіл Нальгіеў. Ён быў прымусова вернуты ў Расію 10 траўня, нягледзячы на перасцярогі, што яму пагражалі палітычны пераслед, катаванні і іншыя віды жорсткага абыходжання, а таксама несправядлівае судовае разбіральніцтва. У Расіі ён быў затрыманы па палітычна матываваным абвінавачванні ў "прымяненні сілы ў дачыненні да службовай асобы" у сувязі з акцыямі пратэсту ў Інгушэціі 26-27 сакавіка.

У якасці станоўчага прыкладу, 17 чэрвеня іранскаму грамадзяніну Мехрдаду Джамшыдзіяну быў выдадзены гадавы від на жыхарства "па гуманітарных меркаваннях". У верасні ён быў падоўжаны да пяці гадоў. Мехрдад Джамшыдзіян, які пражывае ў Беларусі з 1993 года і жанаты з мясцовай грамадзянкай, з якой у яго трое дзяцей, правёў 11 месяцаў у ізалятары часовага ўтрымання пасля просьбы аб дэпартацыі з Ірана, дзе яму пагражалі катаванні і іншыя віды жорсткага абыходжання, а таксама смяротнае пакаранне.